УДК 94(476)

**І. А. Андарала**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АГУЛЬНАЯ КАНЦЭПЦЫЯ І АСНОЎНЫЯ МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ ПА РАЗВІЦЦІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1943–1980-Я ГГ.

У артыкуле раскрываецца аўтарская канцэпцыя і метадалогія даследавання дзяржаўнай палітыкі па развіцці агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі ў 1943–1980-я гг. Яна ўключае гісторыка-матэрыялістычны і элементы цывілізацыйнага падыходаў, дасягненні тэарэтычнай думкі, заснаваныя на навуковых даследаваннях гісторыкаў, філосафаў, педагогаў, палітычных і дзяржаўных дзеячаў мінулага і сучаснасці па праблемах агульнаадукацыйнай школы.

**Ключавыя словы:** канцэпцыя, метадалогія, дзяржаўная палітыка, адукацыя, школа.

**I. A. Andarala**
Belarusian State Technological University

# GENERAL CONCEPT AND BASIC RESERCH METHODS OF STATE POLICY FOR THE DEVELOPMENT OF GENERAL SECONDARY EDUCATION IN BELARUS IN THE 1943–1980s

The article reveals the author's concept and methodology for the study of state policy on the development of general secondary education in Belarus in the 1943–1980s, which includes the historical-materialistic and elements of civilization approaches, the achievements of theoretical thought based on scientific research of historians, philosophers, teachers, political and statesmen of the past and present on the problems of secondary schools.

**Key words:** concept, methodology, public policy, education, school.

**Уводзіны.** Айчынная гістарычная навука разглядае метадалогію як вучэнне аб навуковым метадзе пазнання або як сістэму навуковых прынцыпаў, на якіх грунтуецца даследаванне і ажыццяўляецца выбар сукупнасці пазнавальных сродкаў, метадаў, прыёмаў для яго правядзення. Асноўнымі функцыямі, якія выконвае метадалогія, з’яўляюцца: вызначэнне спосабаў атрымання навуковых ведаў, якія адлюстроўваюць дынамічныя працэсы і з’явы; накірункі даследавання для дасягнення навукова-даследчай мэты; забеспячэнне ўсебаковага атрымання інфармацыі аб працэсе або з’яве, якая вывучаецца; аказанне дапамогі ва ўключэнні новай інфармацыі ў абыход; забеспячэнне ўдакладнення, узбагачэння, сістэматызацыі тэрмінаў і паняццяў; стварэнне сістэмы навуковай інфармацыі, якая грунтуецца на навуковых фактах. Такім чынам, метадалогія – гэта канцэптуальнае абгрунтаванне мэты, зместу, метадаў даследавання, якія забяспечваюць атрыманне максімальна аб’ектыўнай, дакладнай, сістэматызаванай інфармацыі аб працэсах і з’явах.

**Асноўная частка.** У адпаведнасці з аб’ектам нашага даследавання мы прытрымліваемся канцэпцыі, што на працягу ўсёй савецкай гісторыі, у тым ліку і з 1943 па 1980-я гг., дзяржаўная палітыка ў галіне развіцця агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі з’яўлялася састаўной часткай агульнай партыйна-дзяржаўнай палітыкі як СССР у цэлым, так і Беларускай ССР, у прыватнасці, адпавядала класавай дактрыне і вызначаным у дакументах КПСС стратэгічным і тактычным мэтам. Менавіта таму практычна ўся дзейнасць агульнаадукацыйнай школы краіны вызначалася сумеснымі рашэннямі ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР. Як правіла, гэтыя рашэнні дубліраваліся на ўзроўні ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР.

Пад дзяржаўнай палітыкай па развіцці агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі мы разумеем агульны план дзеянняў палітыка-адміністрацыйных органаў улады рэспублікі, накіраваных на рашэнне важных, уплывовых на адукацыю і выхаванне вучнёўскай моладзі праблем.

Сярэдняя агульнаадукацыйная школа рэспублікі за акрэслены намі савецкі перыяд прайшла доўгі шлях свайго гістарычнага развіцця. Будучы дэтэрмініравана гістарычна, школьная палітыка, якая праводзілася ў БССР, не магла заставацца нязменнай. Яна фарміравалася ў адпаведнасці з аб’ектыўнымі ўмовамі, у якіх знаходзілася савецкая дзяржава і рэспубліка з іх запатрабаванасцю ў гістарычна вызначаным узроўні адукацыі і культуры насельніцтва, а таксама неабходнасцю нарошчваць інтэлектуальны

патэнцыял грамадства. Побач з гэтымі аб'ектыўнымі ўмовамі на фарміраванне школьнай палітыкі ў рэспубліцы аказаў уздзеянне такі істотны суб'ектыўны фактар, як стратэгія і тактыка кіруючай камуністычнай партыі ў галіне развіцця агульнаадукацыйнай школы.

Выкарыстоўваючы сваё манапольнае становішча ў савецкім грамадстве, КПСС распрацоўвала стратэгію і асноўныя накірункі развіцця сярэдняй агульнаадукацыйнай школы краіны зыходзячы са свайго бачання шляхоў і сродкаў пабудовы сацыялізму, сваіх палітычнай, ідэйна-тэарэтычнай і арганізатарскай функцый: усеагульная і роўная адукацыя ўсіх дзяцей і падлеткаў, стварэнне ўмоў, якія забяспечвалі яе даступнасць; паэтапнае авалоданне ўсё больш высокім узроўнем агульнай адукацыі (усеагульная пачатковая, затым сямігадовая, васьмігадовая, сярэдняя); вызначала агульную накіраванасць школы як адзінай, працоўнай, політэхнічнай; забяспечвала панаванне марксісцка-ленінскай ідэалогіі і светапогляднай накіраванасці вучэбнага і выхаваўчага працэсаў.

Манапалізм партыі распаўсюджваўся і на арганізацыйнае забеспячэнне рэалізацыі школьнай палітыкі ў жыццё. Гэта вырашалася праз жорсткую кадравую работу, ідэалагічны кантроль кіруючых і педагагічных кадраў. Многія рашэнні па развіцці агульнаадукацыйнай школы мелі сілу адміністрацыйнага распараджэння, дзе неабходныя эканамічныя і матэрыяльныя перадумовы падмяняліся пазаэканамічнымі мерамі на аснове партыйнай дысцыпліны.

Для доказу вылучанай канцэпцыі неабходна пераасэнсаваць змест і вынікі партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва сярэдняй агульнаадукацыйнай школай рэспублікі ў акрэслены намі гістарычны перыяд.

Безумоўна, з улікам важнасці школьнай адукацыі ў сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі праблема генезісу агульнаадукацыйнай школы Беларусі ў 1943–1980-я гг. знайшла сваё асвятленне ў працах беларускіх навукоўцаў савецкага часу. Аднак партыйная манаполія аказала свой уплыў і на падыходы да даследавання палітыкі па развіцці савецкай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы БССР. Працы гісторыкаў савецкага перыяду абапіраліся на тэарэтычныя пастулаты кіруючай камуністычнай партыі і практыку кіраўніцтва партыйна-дзяржаўных структур адукацыйнай сферай. Перакананасць у правільнасці партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў галіне школьнай адукацыі асноўвалася на поспехах, дасягнутых савецкай школай у канцы 1920–1930-х гг. (ліквідацыя непісьменнасці, увядзенне ўсеагульнага пачатковага навучання). Менавіта таму ў працах беларускіх гісторыкаў асноўная ўвага ўдзялялася адлюстраванню беспамылковасці партыйна-дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі, гіпертрафіраванай пазітыўнай ацэнцы поспехаў і дасягненняў у развіцці агульнаадукацыйнай школы, фарміраванню ўяўлення аб вырашанасці асноўных праблем навучання і выхавання навучэнцаў. Спробы нестандартнага і неазнагажыраванага погляду на генезіс школьнай адукацыі БССР натыкаліся на жорсткую забарону. У тых жа выпадках, калі крытыка выказвалася, аўтары вымушаны былі дзейнічаць у рамках агульнапрынятай (дакладней – дазволенай) метадалагічнай дактрыны. Адсутнасць у даследаваннях усебаковага аналізу наяўных праблем і супярэчнасцей негатыўна сказвалася на ўзроўні навукова-тэарэтычных абагульненняў і вывадаў, зніжала практычную значнасць навуковых рэкамендацый.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на даволі шырокую гістарыяграфію па пытаннях партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва школьнай адукацыяй рэспублікі, па-за межамі тэарэтычнага і практычнага асэнсавання аказаліся многія аспекты развіцця агульнай сярэдняй адукацыі і яе месца ў сістэме грамадскіх адносін. У прыватнасці, не атрымалі неабходнага асвятлення супярэчнасці паміж узроўнем агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі навучэнцаў і грамадскімі патрэбнасцямі, прадыктаванымі навукова-тэхнічным прагрэсам.

Сёння ў постсавецкай гістарычнай навуцы ідуць працэсы ўдакладнення і ўзбагачэння метадалогіі даследаванняў, вызвалення яе ад дагматызму і ідэалагічных штампаў, празмернай палітызацыі. Усё больш выразна праяўляецца тэндэнцыя пераходу да метадалагічнага плюралізму, які дае магчымасць выкарыстоўваць любы філасофска-сацыялагічны інструментарый ва ўсёй яго разнастайнасці для дасягнення аб'ектыўнасці ў пазнанні гістарычнага развіцця. Адны вучоныя лічаць гэта натуральнай заменай састарэлых тэарэтычных пастулатаў і падыходаў новымі, другія называюць іх метадалагічнай рэвалюцыяй. Тым не менш ўсе яны прызнаюць дадзеныя з'явы заканамернымі, але далёкімі ад завершанасці і выступаюць за працяг распрацоўкі метадалогіі гістарычных даследаванняў.

Метадалагічную аснову даследавання дзяржаўнай палітыкі па развіцці сярэдняй агульнаадукацыйнай школы ў акрэслены намі перыяд склаў комплексны дыялектыка-матэрыялістычны падыход у пазнанні, згодна з якім развіццё грамадства разглядаецца як гістарычны працэс, які абумоўлены аб'ектыўнымі заканамернасцямі і разам з тым знаходзіцца пад уплывам суб'ектыўнага фактару (дзейнасць палітычных партый, асоб). Дыялектычны падыход дазволіў

абгрунтаваць прычынна-выніковыя сувязі, працэсы дыферэнцыяцыі і інтэграцыі, пастаянную супярэчнасць паміж сутнасцю і з’явай, зместам і формай, аб’ектыўнасць у ацэнцы дзяржаўнай палітыкі па развіцці агульнаадукацыйнай школы рэспублікі ў межах перыяду даследавання.

У якасці тэарэтыка-метадалагічнай асновы даследавання намі былі выкарыстаны базавыя прынцыпы гістарычнай навукі, якія прызнаюцца прадстаўнікамі розных гісторыка-філасофскіх школ і накірункаў – аб’ектыўнасці, гістарызму, сістэмнасці, сацыяльнага падыходу, пераемнасці. Яны садзейнічаюць вывучэнню разнастайных працэсаў і з’яў у іх развіцці і ўзаемасувязі на аснове выкарыстання шырокага кола крыніц. Гэта дазволіла найбольш поўна здзейсніць навуковую рэканструкцыю працэсу пасляваеннага аднаўлення і наступнага развіцця школьнай адукацыі ў Беларусі.

Прынцып аб’ектыўнасці з’яўляецца асновай сучаснай навуковай практыкі. Ён патрабуе непрадузятасці, незалежнасці меркаванняў ад светапоглядных і грамадска-палітычных арыентацый даследчыка. Навуковая аб’ектыўнасць у першаю чаргу заключаецца не ў адхіленні крытычных меркаванняў і ацэнак, а ў грунтоўным высвятленні рэальных працэсаў і супярэчнасцей, што праяўляюцца на працягу пэўнага перыяду даследавання.

У савецкі час у выніку цеснай залежнасці метадалогіі ад дзяржаўнай ідэалогіі гістарычныя навуковыя даследаванні, як правіла, праводзіліся ў рэчышчы дасягненняў партыйна-дзяржаўнай палітыкі ў розных галінах, у тым ліку і ў сферы развіцця школьнай адукацыі. Такі вузкапартыйны падыход пры аналізе грамадска-эканамічнага становішча, сацыяльных працэсаў, якія адбываліся ў грамадстве, пярэчыў аб’ектыўнаму адлюстраванню пазітыўных і негатыўных тэндынцый у сферы агульнай сярэдняй школы. Плюралізм у метадалогіі дазволіў вывучаць гістарычны вопыт развіцця школьнай адукацыі з пазіцый аб’ектыўнасці, уліку канкрэтнай сацыяльна-палітычнай абстаноўкі, матывацыі дзяржаўных рашэнняў у канкрэтны гістарычны перыяд на аснове верагодных фактаў і гістарычных падзей. Збор, сістэматызацыя і аналіз канкрэтнага фактычнага матэрыялу, што быў пачэрпнуты з разнастайных крыніц, яго навуковае асэнсаванне дало нам магчымасць скласці найбольш поўнае і дакладнае ўяўленне аб дзяржаўнай палітыцы ў галіне развіцця агульнай сярэдняй адукацыі рэспублікі ў акрэслены намі перыяд. Пры гэтым мы імкнуліся прытрымлівацца аб’ектыўных ацэнак розных навуковых поглядаў на працэсы школьных пераўтварэнняў, пазбягаць папярэдніх стэрыятыпаў пры аналізе вынікаў у развіцці сярэдняй агульнаадукацыйнай школы рэспублікі.

Зыходзячы з таго, што аб’ектыўны аналіз і асэнсаванне дзяржаўнай палітыкі па развіцці школьнай адукацыі Беларусі ў акрэслены перыяд магчымы толькі пры ўмове яе даследавання ў строгай адпаведнасці з канкрэтна-гістарычнымі абставінамі, у іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці, мы таксама кіраваліся прынцыпам гістарызму. Выкарыстанне яго ў навуковых даследаваннях грунтуецца на шэрагу ўласцівых яму пераваг.

У прыватнасці, універсальнасці, даступнасці і зручнасці, неабмежаванасці храналагічных і пpасторавых перыядаў навуковага пошуку, разнастайнасці арсеналу ўзаемадапаўняючых гістарычных метадаў, іх арганічнай сувязі з агульнанавуковымі і іншымі метадамі даследавання.

Выкарыстанне прынцыпу гістарызму забяспечыла магчымасць вызначыць стан даследавання праблемы развіцця агульнаадукацыйнай школы Беларусі ў сувязі з гістарыяграфічнай сітуацыяй, якая мела месца ў розныя перыяды назапашвання ведаў па данай тэматыцы. Паслядоўная апора на яго стала асноўнай перадумовай вызначэння ўплыву сацыяльна-эканамічных, сацыяльна-палітычных і іншых фактараў, дэтэрмініруючых падзей, тэндэнцый і супярэчнасцей развіцця сярэдняй агульнаадукацыйнай школы рэспублікі на этапах яе паступальнага развіцця ў межах акрэсленага перыяду. Грунтуючыся на прынцыпе гістарызму, былі прааналізаваны прычыны і вынікі рэфармавання агульнаадукацыйнай школы. Глыбокі і аб’ектыўны аналіз назапашанага школьнай сістэмай гістарычнага вопыту садзейнічаў атрыманню больш поўных навуковых абагульненняў і аргументаваных высадаў. Гістарычны вектар даследавання эвалюцыі школьнай адукацыі дазволіў выявіць механізм фарміравання дзяржаўнай палітыкі ў галіне школьнай адукацыі рэспублікі ў канкрэтна-гістарычных умовах і эфектыўнасць яе рэалізацыі.

Даследаванне таксама грунтавалася на прынцыпе сістэмнасці. Як адзін з фундаментальных класічных прынцыпаў сучаснага навуковага пазнання, ён прадугледжвае даследаванне з’яў не ізалявана, як аўтаномных адзінак, а як узаемадзеянне і сувязь розных кампанентаў цэлага, выяўлення ў сістэме тэндэнцый і асноўных заканамернасцей. У адпаведнасці з прынцыпам сістэмнасці дзяржаўная палітыка ў галіне агульнай сярэдняй адукацыі разглядалася намі як цэласная з’ява ў сукупнасці прычынна-выніковых і функцыянальных сувязей. Прынцып сістэмнасці непасрэдна

спрыяў выбару шляхоў і спосабаў рашэння пастаўленых у даследаванні задач, лагічна-паслядоўнаму выкладу матэрыялу.

Апора на прынцып сацыяльнага падыходу абавязвала разглядаць развіццё агульнай сярэдняй адукацыі як сацыяльна-культурную з'яву, на якую аказвае ўплыў сукупнасць розных фактараў (палітычных, ідэалагічных, эканамічных, сацыяльных) у комплексе з суб'ектыўным уплывам дзяржаўных асоб.

Важнай перадумовай для аналізу гістарыяграфіі па праблеме даследавання меў прынцып пераемнасці, які часта ігнараваўся, асабліва ў дачыненні да навуковых прац даследчыкаў савецкага часу. Выкарыстанне дадзенага прынцыпу дало магчымасць забяспечыць сувязь новых ведаў з навуковымі напрацоўкамі папярэднікаў і пазбегнуць суб'ектывізму ў ацэнцы гістарыяграфіі развіцця агульнай сярэдняй школы рэспублікі ў акрэслены перыяд.

Прынцыпы гістарычнага пазнання ў працэсе даследавання рэалізаваліся намі праз выкарыстанне агульных філасофскіх (дыялектычны), агульнанавуковых (аналіз і сінтэз, сістэмна-структурны), міждысцыплінарных (параўнальна-статыстычны, сістэматызацыі) і спецыяльных гістарычных (гісторыка-генетычны, праблемна-храналагічны, гістарыка-параўнальны, навуковай абстракцыі, перыядызацыі, эўрыстычнага) метадаў даследавання.

На агульнафіласофскім узроўні тэарэтыка-метадалагічную аснову даследавання склала сукупнасць ідэй, якія адносяцца да дыялектыка-матэрыялістычнага разумення тэорыі і гісторыі. Дзякуючы гэтаму, мы мелі магчымасць аб'ектыўна і ўсебакова прааналізаваць генезіс сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі рэспублікі.

Агульнанавуковыя метады дазволілі лепш усвядоміць працэс развіцця агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі ў акрэслены перыяд і выдзеліць пэўныя асаблівасці і тэндэнцыі для розных часовых этапаў.

Метады аналізу і сінтэзу далі магчымасць разгледзець школьную адукацыйную мадэль рэспублікі як арганізаваны комплекс элементаў, складаючых яго цэласнасць.

У прыватнасці, да метаду перакрыжаванага і параўнальнага аналізу мы звярталіся ў працэсе работы са статыстычнымі выданнямі савецкага перыяду, паколькі яны складзены па спецыфічнай методыцы.

Сістэмна-структурны метад прадугледжвае вывучэнне ўнутраных сувязей паміж элементамі сістэмы. Яго асаблівасць заключаецца ў тым, што ён арыентаваны на раскрыццё цэласнасці аб'екта, на выяўленне разнастайных тыпаў сувязей і звядзення іх у адзіную тэарэтычную карціну. Выкарыстанне намі сістэмна-структурнага метаду дазволіла вызначыць галоўныя структурныя элементы школьнай мадэлі рэспублікі ў межах даследавання і іх узаемаўплыў.

Значная ўвага ў ходзе даследавання намі ўдзялялася выкарыстанню міждысцыплінарных метадаў даследавання.

Пры даследаванні дынамікі колькасных і якасных змен у сетцы школ, кантынгенце навучэнцаў, складзе настаўніцкіх кадраў шырока выкарыстоўваўся параўнальна-статыстычны метад. Ён дазваляў адсачыць эвалюцыю паказчыкаў на працягу ўсяго вызначанага перыяду. На падставе архіўных матэрыялаў была зроблена апрацоўка даных і прааналізаваны па гадах змены, якія адбыліся ў колькасці школ, навучэнцаў і настаўнікаў на працягу перыяду даследавання.

Метад сістэматызацыі прадугледжвае ўпарадкаванне пэўнага мноства разрозненых аб'ектаў і ведаў пра іх. Упарадкаванне ажыццяўляецца шляхам адрознення і аднолькавасці структур і элементаў. Вынікам сістэматызацыі становіцца стварэнне пэўнай сістэмы аб'ектаў. Метад сістэматызацыі выкарыстоўваўся намі ў ходзе вывучэння і аналізу гістарыяграфіі. Такім чынам, навуковыя напрацоўкі, выкарыстаныя ў працэсе даследавання, былі згрупіраваны па пэўных агульных характарыстыках. Метад сістэматызацыі таксама быў выкарыстаны пры аналізе базы крыніц даследавання.

Асабліва важнае значэнне ў даследаванні мела выкарыстанне спецыяльных гістарычных метадаў даследавання.

У прыватнасці, сярод спецыяльных метадаў гістарычнага пазнання намі быў выкарыстаны гісторыка-генетычны метад даследавання. Яго прымяненне садзейнічала ўстанаўленню прычынна-выніковых сувязей і заканамернасцей гістарычных падзей. Таксама мы змаглі вызначыць вытокі нездавальняючага стану матэрыяльнай базы агульнаадукацыйных школ. У ходзе даследавання даказана іх сувязь з развіццём народнай гаспадаркі.

У аснову кампанавання раздзелаў навуковай працы пакладзены праблемна-храналагічны метад. Яго выкарыстанне дапамагло вызначыць структурную кампазіцыю даследавання, не парушаючы пры гэтым паслядоўнасць развіцця гістарычных падзей. Такі падыход дазволіў прасачыць эвалюцыю палітыкі ў сферы школьнай адукацыі.

Апора на гісторыка-параўнальны метад дазволіла даследаваць мэты, задачы і асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў галіне школьнай адукацыі на розных этапах развіцця грамадства.

Выкарыстанне метаду навуковай абстракцыі дало магчымасць засяродзіць увагу на найбольш сутнасных асаблівасцях працэсу і пакінуць без увагі другараднае. З дапамогай навуковай абстракцыі фарміруецца ідэальны вобраз рэальнасці, таму ў ходзе даследавання ўдалося вызначыць асноўныя тэндэнцыі ў развіцці агульнаадукацыйнай школы Беларусі ў вызначаны часовы дыяпазон.

Вызначэнню структуры даследавання спрыяў метад перыядызацыі, дзякуючы якому знойдзена ўзаемасувязь перыядаў развіцця школьнай адукацыі са зменамі ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі.

Для аналітыка-пошукавай работы ў архіўных установах выкарыстоўваўся эўрыстычны метад.

Адна з асаблівасцей выкарыстанай намі метадалогіі заключалася ў прымяненні герменеўтычнага метаду, які патрабуе тлумачэння гістарычных фактаў не толькі з храналагічных, але і «сутнасных», сэнсавых пазіцый.

**Заключэнне.** Камбінаванае выкарыстанне агульных філасофскіх, агульнанавуковых, міждысцыплінарных і спецыяльна-гістарычных метадаў дазволіла дасягнуць пастаўленай мэты даследавання, вырашыць вызначаныя задачы, сфармуляваць аргументаваныя высновы.

**Інфармацыя пра аўтара**

**Андарала Ігар Аляксандравіч** – кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: aia1106@mail.ru

**Information about the author**

**Andarala Igar Alexandrovich** – PhD (Pedagogics), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic Belarus) E-mail: aia1106@mail.ru

*Паступіў 15.09.2020*